**Касаты, Л.** У сілу жорсткасці не верыць / Л. Касаты // Міёрскія навіны. – 2012. – 14 лют. – С. 1.

# У СІЛУ ЖОРСТКАСЦІ НЕ ВЕРЫЦЬ



Размаўляю з Яраславам Анатольевічам Машарам. У свой час ён служыў у абмежаваным кантынгенце савецкіх войск у Афганістане.

– Нам гаварылі, – адзначае субяседнік, – што афганская рэвалюцыя знаходзіцца ў небяспецы і чакае дапамогі з боку СССР. У той час вялося шмат спрэчак наконт правамернасці ўводу ў Афганістан нашых войск, не сціхаюць яны і сёння. Як жа ацэньваю гэты крок я цяпер? Адназначна адказаць немагчыма. Але тады неабходна было процістаяць Злучаным Штатам Амерыкі. Дарэчы, менавіта ў 70-80-х на тэрыторыі Афганістана Савецкая Армія ўпершыню сутыкнулася з міжнародным тэрарызмам. Далёка не ўсе так званыя «душманы» былі фанатыкамі, змагаліся «за ідэю» – многія ішлі ў банды, спакусіўшыся магчымасцю лёгкай здабычы. Бандфарміраванні ў Афганістане шчодра фінансаваліся спецслужбамі ЗША, Саудаўскай Аравіі, Пакістана і іншых краін.

Яраслаў нарадзіўся ў вёсцы Краснае непадалёку ад Наўгарод. Вучыўся ў мясцовай школе. Пасля Наўгародскай васьмігодкі сярэднюю адукацыю атрымліваў вочна-завочна ў Міёрах. Юнаком пайшоў на вадзіцельскія курсы, якія былі арганізаваны па лініі ДТСААФ. Да арміі ў калгасе «Перамога» паспеў папрацаваць. Восенню 1979-га атрымаў павестку на службу. Накіравалі ў артылерыю. У Горкаўскай вобласці 5 месяцаў праходзіў курс маладога байца.

– Мы спецыялізаваліся на знішчэнні танкаў, – расказвае Яраслаў Анатольевіч. – Знаёміліся з будовай і прымяненнем так званых ПТУРСаў. 15 мая 1980-га быў у Афганістане. Перад гэтым 15 дзён затрымалі ў Самаркандзе – ішло папаўненне. Трапіў у аэрадромную групу, якая дыслакавалася непадалёку ад гарадка Шандант. Быў камандзірам аддзялення. Прыкладна праз тры месяцы стаў вадзіцелем аўтамабіля ЗІЛ-131.

Ваенны вадзіцель са сваёй тэхнікай, можна сказаць, быў на пастаянным прыцэле ў непрыяцеля. Вазіў у асноўным боепрыпасы, снарады, тракі для танкаў, харчаванне. Дарогі своеасаблівыя. Непадалёку вядомая, напэўна, усім Кушка – самая паўднёвая кропка СССР.

– Смерць многа разоў хадзіла побач, але, дзякуй Богу, не зачапіла, застаўся жывы, – разважае былы салдат. – У гарах уначы холадна, а ўдзень – спякота. Вадзіцелю круціць баранку было складана. А яшчэ напружанне, бо ў любы момант машыну маглі абстраляць.

Чарговае заданне. Трэба было даставіць груз на апорны пункт. Дарога спакойная. І раптам аўтамабіль зарыўся носам у пясок, раздаўся выбух.

– У кабіне нас было двое – я і прапаршчык. У першыя секунды не зразумелі, што здарылася. Падумалі, што трапілі ў засаду. Хутка зарыентаваліся і ўбачылі, што левае кола аўтамабіля адарвана. Значыць, спрацавала міна. Хутчэй яна была пастаўлена ў разліку на пяхоту. Мы засталіся цэлымі. Паколькі ЧП адбылося непадалёку ад часці, то прапаршчык пабег туды за цягачом, а я застаўся на пасту. Усё закончылася добра.

Пытаюся ў былога афганца пра ўзаемаадносіны сярод салдат.

– На батарэі служылі 24 чалавекі. Сярод іх толькі чацвёра славян, астатнія – узбекі, татары, таджыкі. Лічылі, што нас паслала Айчына абараняць дзяржаўныя інтарэсы – і мы павінны былі ваяваць, выконваць свой абавязак. Мабыць, камусьці здасца дзіўным, але самыя добрыя ўспаміны, самыя цёплыя пачуцці звязаны менавіта са службай у Афганістане. Вайна мабілізоўвала людзей на праяўленне самых лепшых чалавечых якасцяў. Там жыццё кожнага залежыла ад усіх астатніх. Лічу, была сярод нас сапраўдная згуртаванась і падтрымка. Калі і ўзнікалі нейкія непаразуменні, то гэта тычылася побыту. Праблемы вырашаліся па-сяброўску.

Цікаўлюся, а як з «афганскім сіндромам»?

– Пасля дэмабілізацыі мне сапраўды чагосьці не хапала, – разважае Яраслаў Анатольевіч. – Ганаруся, што адслужыў дастойна, імкнуўся быць карысным таварышам па зброі. Нельга не сказаць і пра тое, што мы дапамагалі мірнаму насельніцтву – старым, жанчынам, дзецям. За што мне павінна быць сорамна?

Паўтара года адслужыў Я. А. Машара на афганскай зямлі. Пасля дэмабілізацыі вярнуўся ў родныя мясціны. Зноў пайшоў у калгас. Працаваў вадзіцелем на розных аўтамабілях, а цяпер аўтаслесар.

– Звычайнае вясковае жыццё, – дадае Яраслаў Анатольевіч. – Праца ў гаспадарцы, асноўны занятак – рамонт тэхнікі. Цяпер моцныя маразы, даводзіцца часцей бываць на фермах, бо замярзаюць паілкі. Не абысціся ў сельскай мясцовасці без сваёй гаспадаркі, а ў вольную часіну бягу на рыбалку.

Пацікавіўся ў былога афганца наконт сувязяў з аднапалчанамі.

– Рэгулярна сустракаюся з тымі, хто жыве ў нашым раёне. Ёсць стасункі з украінскімі хлопцамі.

Завяршыць размову пра воіна-афганца хочацца радкамі верша:

«У сілу жорсткасці не веру,
Я веру ў сілу дабрыні.»

**Л. КАСАТЫ**